ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
16
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 23 (1399)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
ТЭЛЕТАЙП
• Учора • Сёння • Заўтра •

### МЕСЯЧНІК

па прапагандзе і распаўсюджанню беларускай літаратуры праводзіць кніжны магазін № 19 «Метадычная кніга». Навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, студэнты, кнігалюбы універсітэта змогуць набыць тут кнігі Р. Бёрнса, М. Лужаніна, А. Чарнышэвіча, М. Лынькова, І. Навуменкі, П. Панчанкі на беларускай мове.

А. ЧУДЗЯНКОВА.

### СЁМЫ ВЫПУСК

зрабіў універсітэт марксізму-ленінізму, што працуе пры БДУ імя У. І. Леніна. 43 чалавекі атрымалі дыпломы аб палітычнай адукацыі ў сістэме вышэйшага звяна.

На працягу двух гадоў слухачы — выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта — наведвалі лекцыі па праблемах эканамічнай палітыкі партыі, сацыяльнай псіхалогіі, актуальных праблемах этыкі і эстэтыкі, марксісцка-ленінскай філасофіі і іншых дысцыплінах.

А. ЗЕЛЯНКОЎ,
дэкан універсітэта марксізму-ленінізму.

### СЯРЭБРАНЫМ ПРЫЗЁРАМ

першынства ВНУ рэспублікі па баскетболу сярод жанчын стала зборная каманда універсітэта. Рашаючы паядынак нашы баскетбалісткі правялі з камандай Інстытута фізкультуры і згулялі ўнічыю. У дадатковай пяцімінутцы перамаглі студэнткі ІФК.

В. ШХІНЬЯН,
супрацоўнік кафедры фізвыхавання і спорту.

### НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ

бюро камітэта камсамола разгледзела работу студэнцкай сацыялагічнай лабараторыі універсітэта.

На бюро таксама заслуханы вынікі праверкі ўплаты членскіх узносаў у камсамольскіх арганізацыях супрацоўнікаў і выкладчыкаў. За адсутнасць кантролю за ўплатай членскіх узносаў сакратару камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў філфака В. Сідарэнка аб'яўлена строгая вымова з занясеннем ва ўчотную картку, сакратару камсамольскай арганізацыі хімфака І. Жоліку—строгая вымова.

Бюро камітэта камсамола заслухала інфармацыю аб выніках палітзаліку ў камсамольскіх арганізацыях універсітэта.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

● ФОТАРЭПАРТАЖ

## ЧАС АБАРОНЫ ДЫПЛОМАЎ

ТЭМА ДЫПЛОМНАЙ работы Вольгі Мірончыкавай надзённая: «Эканамічнае супрацоўніцтва краін —членаў СЭУ ў сферы прамысловай вытворчасці». Студэнтка не толькі асвятліла агульныя і найбольш важныя напрамкі супрацоўніцтва нашай краіны з сацыялістычнымі краінамі, але і спынілася на ўкладзе нашай рэспублікі ў агульную скарбонку эканамічнага супрацоўніцтва і братэрскай узаемнай дапамогі. Гэта ра-





бота яшчэ больш актуальная і таму, што БДУ імя У. І. Леніна таксама ўносіць уклад у агульную справу. У сценах нашага універсітэта штогод рыхтуюцца дзесяткі высокакваліфікаваных спецыялістаў — грамадзян з Балгарыі, Польшчы, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. І хаця члены дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі зрабілі пэўныя заўвагі, дыпломную работу яны ацанілі станоўча, згадзіўшыся з адзнакай рэцэнзента—старшага выкладчыка М. А. Майракова.

Актыўна выкарыстоўвалі студэнты падрыхтаваныя наглядныя дапаможнікі — дыяграмы, табліцы, карты, прыводзілі дакладныя і яскравыя факты і лічбы, упэўнена адказвалі на пытанні членаў дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі. Увогуле было адзначана, што дыпломнікі паказалі глыбокія і грунтоўныя веды па пытаннях эканомікі сацыялістычных краін, правільна разумеюць міжнародную міралюбівую палітыку нашай дзяржавы, накіраваную на ўмацаванне міру, эканамічнае супрацоўніцтва паміж народамі, ведаюць пра ўзаемадапамогу Савецкай дзяржавы і сацыялістычных краін у развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, у сумеснай распрацоўцы карысных выкапняў, у сацыялістычнай кааперацыі і інтэграцыі. Студэнты ўмеюць практычна выкарыстоўваць свае веды. Дзяржаўная экзаменацыйная камісія падводзіць вынікі шматгадовай сумеснай работы студэнтаў і выкладчыкаў.

**НА ЗДЫМКАХ:** у саставе экзаменацыйнай камісіі —прадстаўнікі кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін кандыдат эканамічных навук Людміла Васільеўна Казлоўская, дацэнты Фёдар Сяргеевіч Фешчанка, Георгій Васільевіч Анічэнка, сакратар Віктар Фёдаравіч Клімаў; абараняецца студэнтка 6-га курса завочнага факультэта аддзялення геаграфіі Вольга Мірончыкава; уважліва сочаць за выступленнем свайго таварыша студэнты-выпускнікі.

Тэкст і фота
В. Шачака.



● КАНФЕРЭНЦЫЯ

## Да глыбінь мовы

ЯРКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫЯЙ глыбокіх ведаў па замежнай мове студэнтаў юрфака і плённай работы выкладчыкаў у гэтай галіне стала праведзеная на факультэце навукова-практычная канферэнцыя па англійскай мове, якая прысвячалася 165-годдзю з дня нараджэння Карла Маркса.

Рыхтаваліся да яе з вялікім энтузіязмам. Для таго, каб канферэнцыя прайшла на высокім узроўні, шмат намаганняў прыклалі ўсе яе ўдзельнікі: прыгожа аформлена пры дапамозе плакатаў і фотаздымкаў аўдыторыя, спецыяльна выпушчана насценгазета. І усё было зроблена рукамі саміх студэнтаў.

Імкненне больш даведацца пра жыццё і творчасць геніяльнага вучонага, праверыць свае веды па замежнай мове сабрала на канферэнцыю студэнтаў усіх курсаў.

Грунтоўныя веды па англійскай мове паказалі вядучыя канферэнцыі В. Гацукевіч і А. Ячнік. З вялікай цікавасцю праслухалі прысутныя пісьмо Карла Маркса яго жонцы — Жэні фон Вестфален, якое прачытаў студэнт IV курса Віктар Хвесяня. Толькі адчуўшы ўсю глыбіню і чысціню пачуццяў паміж Карлам Марксам і яго жонкай можна было прачытаць гэтае пісьмо з такой пранікнёнай цеплынёй і пяшчотай.

На высокім узроўні былі і выступленні іншых удзельнікаў канферэнцыі. Эмацыянальна і захоплена расказвалі аб жыцці правадыра міжнароднага пралетарыяту, яго навуковых працах Ігар Ждановіч, Алхам Мамедаў, Ірына Карпава, Наталля Бадуліна, Вікторыя Беразавенка, Алена Мушынская, Алена Лебедзева і іншыя. Яны спыніліся на важнейшых пытаннях тэорыі дзяржавы і права, разгледжаных у навуковых працах Маркса, на значэнні і ролі прававога рэгуліравання ў грамадскім жыцці.

Канферэнцыя закончана. Але гэты дзень запомніцца надоўга. Мы будзем заўсёды ўдзячныя нашым выкладчыкам за тое, што яны здолелі прывіць любоў да замежнай мовы, веды якой, без сумнення, спатрэбяцца нам у далейшым, а зараз дапамаглі па-іншаму ўспрыняць інфармацыю аб жыцці і дзейнасці Карла Маркса.

**М. БАТРАКОВА,**
**А. ДРАБЫШЭЎСКАЯ,**
**студэнткі юрыдычнага факультэта.**







## АМАЛЬ СУР'ЁЗНА

# СЕСІЯ—ГЭТА... СЕСІЯ

У БІБЛІЯТЭЧНЫХ залах «час пік», прыкметна апусцеў сквер, затое лесвіцы ператварыліся ў найбольш зручныя месцы зацікаўленых дыскусій на самыя разнастайныя тэмы — ад гістмата да супрамата. Ва універсітэце — сесія.

Даваць якія - небудзь парады табе, студэнт, напэўна, ужо позна. Ні дапамагчы, ні падказаць, ні вярнуць прапушчаную лекцыю ўжо нельга. Час не чакае. Аднак практычны вопыт папярэдніх пакаленняў сцвярджае, што да сесіі трэба падыходзіць філасофскі.

Радавацца ці сумаваць, калі ў цябе сесія? Перш за ўсё трэба спыніцца і канчаткова вызначыць свой погляд на свет. Калі ты залічыш сябе ў аптымісты, дык сумаваць няма ніякай прычыны. Адчыні акно, пакладзі на стол падручнікі, сшыткі, канспекты і... спакойна адпраўляйся ў лепшы кінатэатр. Праўда, ёсць небяспека, што, калі ты вернешся з запоўненай залікоўкай, твой светапогляд некалькі зменіцца і будзе ўжо не такім жыццярадасным. Але хто яго ведае. Сесія — гэта... сесія.

Не спрабуй самастойна ацаніць свае веды, пакінь гэта прафесіяналу, а калі ты ўсё ж рашыў даведацца аб тым, што збіраешся праз тры дні здаваць, перш за ўсё паспрабуй набыць канспект.

Што рабіць, калі ты здаў апошні экзамен? Па-першае, не страціць ад шчасця галаву. Па-другое, прызнацца, нарэшце, у любві самай прыгожай дзяўчыне групы. Па-трэцяе, уважліва сабраць усе пакінутыя ў партах канспекты, шпаргалкі, занатоўкі і ўрачыста перадаць гэты скарб маладому пакаленню. Ён ім яшчэ спатрэбіцца, бо сесія — гэта... сесія.

...Дакучлівыя сонечныя промні зусім не лічацца з тым, што не прачытана яшчэ палова падручніка. Па тэлебачанню ідуць самыя цікавыя перадачы. «Каралева Марго», схаваная ў самую далёкую шуфлядку стала, увесь час трапляецца пад рукі. Сесія... Наперадзе хваляванні і надзеі, падзенні і ўзлёты. Наперадзе праца — настойлівая, упартая. Таму што сесія — гэта цяжка. Сесія — гэта адказна. Сесія — хоць і гаварылі мы аб ёй жартам — гэта сур'ёзна.

Шчаслівых білетаў, выдатных адказаў, студэнт!









# Кожны раз—як упершыню

У ДРУГОЙ групе другога курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры—экзамен па замежнай літаратуры XIX стагоддзя.

Па гэтаму курсу чытала лекцыі і цяпер праводзіць экзамен Святлана Дзяменцьеўна Малюковіч.

— Я прымала ў студэнтаў экзамен па антычнай літаратуры. Ужо прайшоў год. І сёння мне зноў хочацца пагаварыць з імі. Мы гутарылі, праўда, на практычных занятках.

Святлана Дзяменцьеўна ўважліва слухае першы адказ. Студэнтка расказвае аб паэзіі і драматургіі Гюго, аб творчай манеры Стэндаля. Выкладчыца час ад часу нешта ўдакладняе, перапытвае. Наогул, адказ нагадвае гутарку, хутчэй дыялог, чым маналог.

— Ці можна гаварыць аб тыпізацыі ў рамантычнай літаратуры?

Выслухаўшы адказ, Святлана Дзяменцьеўна працягвае:

— А мне здаецца, можна. Ведаеце, чаму? — і выказвае сваё меркаванне.

Студэнтка і выкладчыца абмяркоўваюць стыль Дзікенса і Тэкерэя. Размовай, відаць, задаволены і экзаменатар і экзаменуемая.

— У цэлым вынікі экзамена добрыя: шэсць пяцёрак і адзінаццаць чацвёрак. У групе — 23 студэнты. Але чакала пачуць больш моцныя адказы. На лекцыях вучыла сваіх студэнтаў самастойнаму асэнсаванню тэкстаў. Наогул, люблю самастойнасць у меркаваннях. І не шкадую добрых адзнак, калі бачу зацікаўленасць, імкненне спасцігнуць часта даволі складаную творчасць пісьменніка,— адзначыла С. Д. Малюковіч.

Лічыцца, што экзамен—праверка ведаў. Так. Але ён яшчэ і іх паглыбленне, удакладненне. Экзамен па замежнай літаратуры XIX стагоддзя на філфаку гэтай мэты дасягнуў.

**С. ВЯРОХА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**







# ТАЛЕНТ ШЧЫРАСЦІ



— ДЗЯЎЧАТЫ, ПАСЫЛКА ПРЫЕХАЛА! Знаёмы голас прымусіў падхапіцца. Спачатку не разабралася, хто крычыць: Лена Дзічэнка ці Зоя Паходня? І толькі праз хвіліну зразумела — зноў снілася Малдавія, іх «Расінка», і чамусьці, па нейкіх нявысветленых законах памяці, гэтая пасылка... Два, тры гады назад было падобнае або кожны раз бывала? Хутчэй за ўсё штогод, таму і ўспамінаецца. «Аб чым думаю, — перапыніла сама сябе. — Няўжо за гады камісарства не адбылося чаго-небудзь больш вартага ўспамінаў?» Усміхнулася — вядома, назапашаны і вопыт, і ўменне, а вось запасдзе ў душу нейкая дробязь...

Спаць ужо не хацелася. Прайшлася па пакою, зірнула на цёмнае акно — позна. Той час, калі нават самыя неўгамонныя жыхары інтэрната супакойваюцца. Успомніла — заўтра свята, а падарункі сяброўкам яшчэ не падрыхтаваны. Добра, што кавалак паркалю ёсць. Нажніцы ўпэўнена выконваюць сваю справу. Нітка з іголкай у руکі — і вось ужо нешта атрымліваецца. За работай не прыкмеціла, як пачало світаць. «Добрай раніцы, Ала Васільеўна! Як пажываеш, Нежавец?» — жартаўліва звярнулася сама да сябе. І сабе ж адказала: «Дзякуй, добра жыву. Вось толькі нейкай несалідная для камсамольскага важака справай займаюся. Ніякай сур'ёзнасці...»

Не, усё ж трэба па начах спаць. Непрадбачаныя малдаўскія ўспаміны неяк выбілі з каляіны. А намесніку сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце трэба быць сабраным чалавекам, умець супакойваць хвалю эмоцый. Здаецца, другі год у камітэце. Ды і ў сябе, на мехмаце, намеснікам сакратара камітэта камсамола была, «вечны» будатрадаўскі камісар, а вось губляецца часам. Шмат спраў, патрабавальныя тэлефонныя званкі, неадкладныя пытанні — да гэтага прывыкла. А імунітэту да няшчырасці не выпрацавала. Таму і пакутуе, іншы раз нават плача, сябе абвінавачвае, маўляў, не разабралася ў нечым, штосьці прагледзела, а права на такую няўважлівасць не мае.

...Чалавек ён быў увогуле нядрэнны. І як камсамолец нараканняў не выклікаў. Усё, што патрабавалі, выконваў, праўда, «адгэтуль дагэтуль», але ж не ўсім быць творцамі. Дакладна рабіць даручаную справу — таксама майстэрства. І раптам прыйшоў да яе. Нейкая сарамлівая ўсмешка на твары:

— Ала, закінь слоўца, каб у інтэртрад уладкавацца...

Чалавек ён быў увогуле нядрэнны. Быў? І сёння ёсць. З ім вітаюцца. Ён выконвае даручэнні «адгэтуль дагэтуль». Толькі ўсё ж быў. Для яе. Прыстасавальніцтва не дарує.

Акно кабінета выходзіць на плошчу Леніна, і яе заўсёдная ажыўленасць зліваецца з гаманлівасцю студэнцкага жыцця.

— Ала, ці можна паехаць важатым у піянерскі лагер?

— А вызваленне ад «бульбы» дадуць, калі два месяцы папрацуеш?

— Ты камсамольскія пуцёўкі ўручыла?

— Не ведаеш, у якой аўдыторыі актыў СБА будзе?

— Дык як наконт вызвалення?..

Пытанні па адрасу і зусім наадварот, зацікаўленыя, і важныя толькі таму, што могуць даць нейкія «перавагі» ці «прывілеі». За імі праблемы, якія часта прыводзяць да ўсведамлення сваіх і чужых памылак. І так цягне зрабіць нешта сапраўднае, прыдумаць такое, чаго ніколі не было! На свята — факельнае шэсце са студэнцкімі песнямі, канцэртнымі нумарамі. Стоп. Хопіць. Здаецца, яна зноў лунае ў воблаках. Але адна ідэя змяняецца другой.

Палітзалік. Такога яшчэ не было — пытанні, палітбаі, палітдыспуты. Усюды толькі і размоў, што пра гэтае навуўвядзенне. І нездарма — ніколі выкладчыкі грамадскіх дысцыплін не атрымлівалі такой колькасці пытанняў ад студэнтаў, як у час падрыхтоўкі да палітзаліку. Ніколі не было праведзена так многа палітінфармацый. Так у самым звычайным было знойдзена нечаканае. Варта для гэтага і ў воблаках палунаць.

...Універсітэт прыкметна ціншэе. Гадзін, напэўна, сем. Так і ёсць — дзевятнаццаць пятнаццаць. І Лена Гулевіч ужо стукае ў сценку. Умоўны знак — збірайся, пара дадому. Як пашчасціла — сябраваць, разам жыць і працаваць. Увесь час побач. І не надакучылі адна адной. Гэта, напэўна, і ёсць шчасце. Не, да шчасця ён не хапае... часу. Каб можна было сесці і чытаць, чытаць, чытаць. Хэмінгуэя і Дастаеўскага, Маякоўскага і Святлова.

А камсамольская дзейнасць? Што дае яна? Нядаўна на партбюро аб гэтым пыталіся. Нечаканаўча яна неяк адказала. На рэкамендацыю кандыдатам у члены КПСС гэта, канешне, уплыву не аказала. Але... Заўсёды трэба дакладна вызначыць для сябе, што на свеце існуе работа і Работа. І маленькая становіцца вялікай толькі тады, калі справа, якой займаешся, — галоўная ў тваім жыцці. Ала прыходзіць на Работу.

**Н. КАЛІШЭВІЧ,**
**наш кар.**

# СПАЧАТКУ—АБ МАЙСТЭРСТВЕ



ІДУЧЫ ПА АПУСЦЕЛЫХ, негаманлівых у час сесіі калідорах хімічнага факультэта, я ўбачыла стэнд з навукова-тэхнічнай інфармацыяй, які даў мне кароткія звесткі аб дзейнасці майго будучага субяседніка. Чытаю подпіс пад фотаздымкамі, дзе пра доктара хімічных навук, прафесара Аліма Аляксандравіча Вечара сказана, што «з 1966 года ён кіруе кафедрай фізічнай хіміі, а з 1977 г. загадвае лабараторыяй. Даследаванні яго звязаны з распрацоўкай асноў матэрыялазнаўства для энергасістэм і прадугледжваюць вывучэнне змяненняў у цвёрдым целе пры экстрэмальных умовах». Ды толькі гэта даведка яшчэ больш пазбавіла мяне рашучасці. Але потым супакоілі другакурснікі, студэнты А. А. Вечара:

— Не хвалюйцеся, Алім Аляксандравіч — цудоўны чалавек. Ён са студэнтамі любіць пагутарыць, заўсёды выслухае.

— І па якой вы справе да мяне? — пытаецца прафесар.

Удакладняю.

— Так, так...

Па вачах Аліма Аляксандравіча вызначаю, як ставіцца ён да журналісцкай брацці.

Відаць, мы вам перашкаджаем сваімі клопатамі?

— Ды не, — усміхаецца ён, — цярпець не магу верхагляднасці.

Адводжу вочы, бо адчуваю непатрэбнасць усіх раней складзеных пытанняў. Здзіўлена: навошта так катэгарычна? Толькі потым, калі праз паўтары гадзіны, закрануўшы праблемы журналістыкі, прафесар будзе з веданнем справы крытыкаваць недахопы газетных загалоўкаў, матэрыялаў, зразумею, што за яго словамі хаваецца ўсебаковая зацікаўленасць.

— Хіба ў хіміі не бывае верхагляднасці?

— Як у любой справе...

— Можа гэта хвароба пачынаецца са студэнцкіх гадоў?

— Так, бо часта студэнт займаецца усім, толькі не вучобай,— зноў жартуе ён.

— А як з наведваннем лекцый?

— Па сакрэту кажучы (здаецца, у прафесара гумар не на апошнім месцы), калі я вучыўся ў МДУ, то прапускаў у меня было больш, чым у каго іншага. Але выкладчыкі нічога зрабіць не маглі, бо ў залікоўцы стаялі толькі пяцёркі. Так што, калі чалавек мае цікавасць і жаданне, ён даб'ецца ўсяго, а калі гэтага няма, ніякі прафесар не пазычыць цягі да вучобы.

Закранута хвалюючае пытанне, можа таму Алім Аляксандравіч схільны крыху перабольшваць.

— Школьная праграма ўжо адстала гадоў на трыццаць. Можна задаць вам пытанне? Спачатку: што ў вас было па хіміі?

Баюся прызнацца, бо ў люстэрку гуманітарных прыхільнасцей мая пяцёрка выглядае не зусім добра.

— Дык вось адкажыце, калі ласка, з чым узаемадзейнічаюць інертныя газы?

— Яны ж не маюць валентнасці? — здзіўляюся я.

— Вядома, так вас вучылі, а між тым ужо трыццаць гадоў назад было даказана, што гэта інакш. Зараз ужо існуюць у прамысловасці некаторыя іх злучэнні з іншымі рэчывамі.

А калі Алім Аляксандравіч расказаў, як даводзілася яму «перавучваць» сыноў, парушаючы аўтарытэт падручнікаў, я крышку пазайздросціла ім: як добра мець побач такога ўпэўненага настаўніка.

Не першы год працягваецца дыскусія наконт фізікаў і лірыкаў. Цікава, якой думкі наконт гэтага Алім Аляксандравіч?

— Сама пастаноўка пытання пярэчыць ісціне. Не трэба прытрымлівацца крайнасцей. Але, разам з тым, чаму лічыцца некультурным не ведаць, калі нарадзіўся Леў Талстой, і зусім нармальным—не памятаць даты жыцця Альберта Эйнштэйна ці не мець ніякага ўяўлення аб элементарных прынцыпах тэорыі адноснасці? Заняткі прыродазнаўчымі навукамі прывучаюць чалавека думаць рознабакова...

Алім Аляксандравіч заўсёды вось такі нечаканы, неардынарны. А то чаму б ён запытаў у мяне, як імя па бацьку Тацціяны Ларынай?

— Ну што, не вельмі інтэрв'ю атрымліваецца, — смяецца Алім Аляксандравіч.

— Чаму ж...

І можа сапраўды не надта ўдала склалася гэтае інтэрв'ю, але няхай прабачаць чытачы, што абмінула праблемы сучаснай хіміі і яе даследчыкаў, бо галоўным было паказаць сапраўднае майстэрства чалавека.

**Э. ОЛІНА.**

КАМАНДАР МАДЖЫДАЎ старанна рыхтаваўся да фінальнага паядынку. У Вільнюс на Міжнародны турнір па класічнай барацьбе імя Івана Паддубнага з'ехаліся амаль усе мацнейшыя барцы свету. Не было толькі спартсменаў ГДР, ЗША і Ірака. Практычна турнір ператварыўся ў «малы» чэмпіянат свету.

# Пачатак перамог

На шляху ў фінал Маджыдаў перамог некалькі выдатных барцоў.

У фінальным паядынку Маджыдава чакаў М. Чарняхоўскі, член зборнай СССР. У яго і вопыту больш, і тытулаў. Жэст суддзі — і Камандар адразу пайшоў у атаку. Ён не пакінуў ніякіх надзей сапернiку на выйгрыш. Сірэна апавясціла перамогу беларускага барца з яўнай перавагай.

Перамога заўсёды прыемная. Гэтая ж для Камандара Маджыдава, слухача падрыхтоўчага аддзялення БДУ імя У. І. Леніна, была прыемнай удвайне: ён упершыню выканаў нарматыў майстра спорту СССР міжнароднага класа.

Камандара вызначае працавітасць. Чым бы ён ні займаўся, усё выконвае хутка і добра. Ён нарадзіўся і рос у рабочай сям'і ў невялікім грузінскім пасёлку Дманісі. Там і пачаў займацца барацьбой.

Чаму Камандар Маджыдаў аказаўся ў Беларусі? Звычайна гавораць, што трэнер шукае спартсмена. Але тут выйшла наадварот. Маджыдаў хацеў трэніравацца, шліфаваць сваё майстэрства. Ён імкнуўся ў нашу рэспубліку, дзе закладзены добрыя традыцыі ў класічнай барацьбе. Ён многа разоў пабываў у Мінску, у трэніровачным комплексе «Стайкі», перш чым прыняць такое рашэнне. І аднойчы, у час турніра ў Запарожжы, Камандару пашанцавала сустрэцца з трэнерам БДУ імя У. І. Леніна Віктарам Аляксандравічам Рудзянковым.

Пасля сустрэчы хлопец засеў за падручнікі. У мінулым годзе маглі б збыцца дзве яго мары: знайсці добрага трэнера і стаць студэнтам юрыдычнага факультэта. Але збылася толькі адна: на факультэт паступіць не ўдалося. І ўсё ж хлопец праявіў настойлівасць — лепш падрыхтаваўся і восенню паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне.

Камандар любіць чытаць, пастаянна на зборах яго можна ўбачыць з кнігай. Звычайна гэта падручнік. Маджыдава паважаюць у групе за яго ветлівасць, шчырасць. Калі праходзіла першынство Мінска, вучэбная група, дзе займаецца Камандар, амаль у поўным саставе сядзела на трыбунах і падтрымлівала свайго таварыша, а пасля перамогі ўсе дружна яго віншавалі.

На спартыўнай арэне поспехі прыходзілі да Маджыдава з незвычайнай хуткасцю. Памяркуйце самі: першае месца на чэмпіянаце СССР сярод прафсаюзных каманд, перамогі на Спартакіядзе і чэмпіянаце БССР, на першынстве Мінска. Гавораць, што на дыване сапернікі яго баяцца. Гэта так.

— У Маджыдава цяжка выйграваць,— гаворыць В. А. Рудзянкоў.— У яго добрая фізічная вынослівасць. Увесь паядынак ён можа правесці ў хуткім тэмпе, а потым праз кароткі час аднавіць ранейшы запас сіл. На думку трэнераў зборнай краіны, Маджыдаў яшчэ не поўнасцю раскрыўся. Калі паназіраеш за трэніроўкай Камандара, здзівішся яго апантанасці. А якія прыёмы асвоіў, асабліва ў партэры! Думаю, што ён зможа перамагчы на Спартакіядзе народаў СССР. Тым больш, што ў час збораў зборнай СССР ён выйграў ва ўсіх асноўных сапернікаў. Цяперашнія перамогі — толькі пачатак.

Пасля заканчэння турніра ў Вільнюсе Маджыдаў выпадкова разбіў хрустальную вазу, якой ён узнагародзілі. Спартсмен засмуціўся.

— Нічога,— супакоіў яго Віктар Аляксандравіч, — посуд б'ецца на шчасце. Значыць, прыйдуць новыя перамогі.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

Аляксандр БЕЛЬСКІ,
студэнт філфака

## ВЯРТАННЕ Ў ДЗЯЦІНСТВА

Забуяў белай квеценню сад...
Куды ні глянь—
Плёсткаў палёт,
Быццам сёння вярнуўся я зноў
У першы снег
Дзяцінства майго.
Што я згубіў там!!
Бясклапотнасць.
Забавы, каляровыя сны,
А потым і роднага бацьку...
Узамен жа знайшоў
Упартасць,
Адкрытасць і веру ў людзей
Разам з імкненнем
Жыць так,
Каб на маёй яблыні жыцця
Не было пустацвету,—
Дзён, што бывае
Праходзяць бясследна.

Леанід ТРУБАЧ,
студэнт філфака

***

Ля бальшаку наўсцяж палеглі камяні
з бінтамі снегу на змарнелых шчоках.
Гнядога толькі словам падгані—
і вецер прымушае заслязіцца вока!
А горыч страты гэтак не растане,
як белы пыл з-пад лёгкіх капытоў.
Штурхае памяць думкі на паўстанне
супраць прыгнёту сцішаных гадоў.
І плача першаю сняжынкай неба,
заспаны сад не хоча распранацца.
Удалеч спяшаемся, рупіць патрэба...
Хто ж да вытокаў з нас будзе вяртацца!

***

Цалуе возера далоні берагоў,
Ласкавасць праз гады яго не кіне.
Паплавы пад надзейнай аховай стагоў
Страчаюць змрок заспакоена-сіні.
Над вёскай буслоў развітальны клёкат
Хвалюе неба тужлівасцю гукаў.
У матулі аб сыне трывожны клопат:
Расстанням у сэрца ёй шлях пастукаў.



Свіслач. Фотаэцюд В. Шачака.

ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ

# ВАБІЦЬ СТЫХІЯ ВАДЫ



**Дзень першы.** Поезд «Мінск — Сочы» з усіх бакоў абступілі турысты. Наша група не адзіная, тут многа іншых. Сярод іх у нас ёсць знаёмыя. Яны таксама едуць на Каўказ, але на іншыя рэчкі: Кадоры, Куру, Алазані, Рыоні. Мы вітаем адзін аднаго, абменьваемся жартамі. Вось нарэшце прагучалі традыцыйныя «выбухі» шампанскага, наперадзе — Каўказ. Прыгажосцю сваіх гор, чыстым паветрам, бурнымі рэкамі, гасціннасцю прыцягвае ён турыстаў. Некаторыя з нас там пабывалі ўжо некалькі разоў, многія едуць упершыню.

У нашай групе восем чалавек: сем хлопцаў і я. «Пасада» мне дасталася таксама жаночая: харчаванне групы — на маіх плячах.

**Дзень другі.** Ноч праляцела імгненна. Раніцой мы выгрузіліся з поезда ў г. Армавіры. Да пачатковай кропкі маршруту яшчэ кіламетраў 250. Далей патрэбна было ехаць на аўтобусах. Але хутка ўсе клопаты мінулі. Мы ў пасёлку Архыз. Тут пачынаецца наш маршрут па рацэ Вялікі Зелянчук.

Лагер паставілі хутка. Нехта ўстанаўліваў палаткі, нехта разводзіў вогнішча, збіраў дровы, рыхтаваў вячэру — карацей, спраў хапіла ўсім. Рабяты ў нашай групе дастаткова вопытныя, і кожны хутка і ўмела рабіў сваю справу. Пакінуўшы родныя месцы, мы стварылі нейкі свой маленькі калектыў, які аб'ядноўвала агульная мэта — паспяхова прайсці цікавы і складаны маршрут. Пасля двух сутак дарогі мы, нарэшце, сядзім каля вогнішча і любуемся прыродай, цячэннем вады ў рэчцы. Але ў думках галоўнае — дзень старту.

**Дзень трэці.** Пакуль дзяжурныя займаліся сняданкам, астатнія рыхтавалі плыты. Потым схадзілі ў пасёлак: пагутарылі з мясцовым насельніцтвам, закупілі прадукты.

У Архызе размешчана некалькі баз адпачынку і турбаза, што дае магчымасць многім наведаць гэтыя цудоўныя месцы. На берагах рэчкі раскінуліся мудрагелістай формы драўляныя домікі. Асабліва прыгожыя яны з вады, напамінаюць дэкарацыі казак.

У гэты дзень мы вырашылі праплыць нямнога, кіламетраў восем. Нашы экіпажы павінны былі прывыкнуць адзін да аднаго, навучыцца дакладна выконваць каманды капітанаў. Наш «флот» складаўся з двух гумавых надуўных плытоў. Першыя кіламетры праплылі без папярэдняга агляду, хаця цячэнне было хуткае і многа каменняў, велізарных валуноў. Увесь час даводзілася быць напагатове: абыходзіць то справа, то злева пенныя ямы, раскіданыя ў беспарадку па ўсім шляху.

**Дзень чацвёрты.** Нарэшце паявіліся першыя складаныя парогі. Іх яшчэ здалёк можна заўважыць па асабліваму шуму вады. Часцей за ўсё складаны парог — гэта мноства раскіданых абы-як каменняў, хуткае цячэнне, вялікі ўхіл ракі на кароткім адрэзку. І гора таму, хто без дастатковага ўмення і вопыту адважыцца ўступіць у барацьбу з сіламі прыроды.

Мы прагледзелі ўвесь парог з берагу, намецілі лінію праходжання. Абыходзім яго з левага боку, стараючыся не чапляць вострых каменняў, абмінаючы велізарны валун. Далей — ланцуг метровых валаў, але яны ўжо нам не страшныя.

Ужо вечарэе, мы шукаем стаянку. Справа высокі бераг і густы кустарнік, злева — побач з рэчкай — праходзіць дарога. Вырашылі спусціцца крыху ўніз. Наш капітан плыта і кіраўнік групы Фёдар Ермаліцкі сказаў: «Пойдзем уперад — чысты праход». Толькі паспелі прайсці праход, і пачалося: цячэнне вельмі хуткае, абыдзем адзін камень, а побач другі, нас кідае з усяе сілы. Але хутка барацьба заканчваецца ў нашу карысць. Тут мы і зрабілі стаянку.

**Дзень пяты.** Сёння раніцай, калі прагледзелі ўчарашні маршрут, здзівіліся, што прайшлі яго сходу. Наш плыт мае на дне дзве дзіркі, але ўнутр вада не трапіла. Капітаны пайшлі аглядаць раку далей. За ноч на схілах выпаў снег. Балера Дзюба ўзяў кінакамеру і здымае нас, прыроду, рэчку. Вельмі прыемна будзе пасля паходу сабрацца разам і «праплыць» увесь маршрут спачатку.

**Дзень шосты.** Сёння ў нас будзе напружаны дзень, але з раніцы адпачываем: ідзе дождж. Кроплі барабаняць па палатцы. Дарэчы, надвор'е тут мяняецца вельмі хутка: з раніцы можа быць сонца, а праз некалькі гадзін — дождж. Пакуль укладвалі рэчы, снедалі, дождж скончыўся, і мы рушылі ў дарогу. На нашым шляху сустракаецца многа груп. Звычайна мы спыняемся, разам абмяркоўваем маршрут, папярэджваем адзін аднаго аб найбольш складаных яго ўчастках.

Мы з Валерам Дзюба сёння дзяжурныя, рыхтуем вячэру, займаемся гаспадарчымі справамі. Перад сном усе разам сядзім ля вогнішча і ціхенька размаўляем. Мне падабаюцца гэтыя гутаркі. Пра што толькі тут не пачуеш: пра новыя кнігі і прэм'еры спектакляў, пра навуковыя адкрыцці і пра спорт... Але больш за ўсё — аб мінулых паходах, смешных гісторыях.

**Дзень сёмы.** Сёння на нашым шляху парогаў няма. Гадзіны за дзве прайшлі мост і дарогу, якія вядуць да абсерваторыі (тут буйнейшы ў свеце тэлескоп). Мяркуем пайсці туды на экскурсію.

Ужо чатыры гадзіны дня. Падсілкаваўшыся, вырашылі плыць далей. Зноў шыверы, пратокі. На адным з паваротаў рэчка разбіваецца на некалькі рукаваў. Мы не паспяваем зрабіць рэзкі паварот і чапляемся паміж двума велізарнымі карчамі. Пакуль «ваявалі» з імі, вада панесла наша вясло.

**Дзень восьмы.** Нас пабудзіў Жураўскі, пракрычаўшы на вуха, што вада спала на паўметра (зразумела, перабольшыў сантыметраў на трыццаць). Хутка паснедалі, сабралі рэчы і паплылі. Кіламетраў праз паўтара трапілі ў «лес» —рэчка цячэ між густых кустоў. Усе ідуць аглядаць маршрут. Недзе патрэбна абсекчы галіны, таму што яны перагароджваюць увесь праход.

Ужо зусім побач станцыя Зелянчукская. Тут мы зможам купіць хлеба і якога-небудзь харчу.

Гадзіны ў чатыры адплываем ад станцыі. Сёння нам патрэбна дайсці да каньёна «кулюк», нашай апошняй перашкоды на гэтай рэчцы.

Ля ўваходу ў каньён на роўным месцы «вырастае» гара. Мясцовыя жыхары яе называюць «грыб-гара». Верхавіна яе пакрыта травой і кустамі. Здалёк сцяна гары нагадвае пашчу кіта, а схіл — тулава. Тут спыняемся на стаянку.

**Дзень дзевяты.** Наш плыт падплывае да ўваходу ў каньён. Ён цягнецца кіламетры на два. Але яго праходзім паспяхова.

**Дзень дзесяты.** Апошні дзень. Ён самы кароткі. У групе ўжо пачынаюцца размовы пра дом, Мінск, пра сяброў. Значыць, мы ўжо сумуем па родных месцах. У ауле сушым свае плыты, збіраем рэчы. Вечарам да нашага вогнішча падышоў чэркес. Ён добра ведае гісторыю свайго народа, перадае расказы сваіх продкаў.

**Дзень адзінаццаты.** Мы ўжо ў горадзе Кіславодску. Многія нашы рабяты паляцелі на самалёце ў Мінск, а нам давядзецца ехаць двое сутак поездам.

...У Мінску нас сустрэлі нашы таварышы. Прыемна было зноў сабрацца ўсёй групай. У маёй запісной кніжцы паявіліся новыя імёны. І я ўпэўнена, што нашы турысцкія маршруты перасякуцца яшчэ не раз.

Г. КАЗЕЙ.
Фота аўтара.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
16 чэрвеня 1983 г.
Зак. 1084 АТ 04303

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ